View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Васіль СТАРЫЧОНАК**

# «ЗЯМНОЕ НАПАЎТОРНАЕ КАХАННЕ»: ПАЭТЫЧНЫ ДЫСКУРС ЛЮБОВІ

У сённяшні час, век глабалізацыі і нанатэхналогій, калі свет практычна нахіліўся ў бок самаразбурэння, павышаецца цікавасць да ўнутранага стану чалавека, свету пачуццёвага пазнання жыцця галоўнага жыхара планеты – чалавека. Звяртанне да тэмы кахання і любові з'яўляецца важным як для разумення агульнага зместу гэтай катэгорыі і вызначэння яе нацыянальнай спецыфікі, так і для высвятлення важнасці маральна-этычных канстантаў у працэсе выхавання чалавека і адаптацыі ідэальных маральных арыенціраў да пастаянна зменлівага кантэксту паводзін чалавека…

Тэма кахання заўсёды хвалявала зямлян. Вакол яе заўсёды вяліся спрэчкі. Аб яго загадкавасці і немагчымасці поўнага вызначэння гаварылі старажытныя паэты Усходу, філосафы старажытнай Грэцыі, асветнікі, паэты і пісьменнікі ўсіх гістарычных эпох і ўсіх нацыянальных кантынуумаў. Дзве тысячы гадоў назад рымскі паэт Альбій Тыбул, аўтар дзвюх кніг элегій пра любоў, пісаў, што каханне – найсаладзейшая таямніца. Генрых Гейнэ назваў каханне сфінксам, тысячагадовай загадкай. «Пра каханне і шчасце можна сказаць тое самае, што аб прывідах, – пісаў французскі пісьменнік Ф.Ларошфуко, – усе гавораць пра іх, але ніхто іх не бачыў». Рускі пісьменнік Іван Тургенеў сцвярджаў, што ў любові ўсё таямніца: як яна прыходзіць, як развіваецца , як знікае. А Міхаіл Прышвін параўноўваў каханне з невядомай краінай: «Любоў – гэта невядомая краіна, і мы ўсе плывём туды кожны на сваім караблі, і кожны з нас на сваім караблі капітан і кіруе караблём сваім уласным шляхам». «Любоў у нас, як скарб, – гаварыла Марына Цвятаева, – мы пра яе нічога не ведаем, уся справа ў выпадку». Так што вывесці формулу любові, спасцігнуць яе законы немагчыма. І ў гэтым загадка і таямніца гэтага вечнага і неспасцігнутага пачуцця?

Што ж такое каханне? У чым яго сутнасць? Ці існуе яно наогул? Як яно прыходзіць і знікае? Паспрабуем адказаць на гэтыя і іншыя пытанні, узяўшы на ўзбраенне шматлікія творы беларускага паэтычнага і філасофскага дыскурсу.

У беларускай мове для выражэння пачуцця гарачай сардэчнай прыхільнасці да асобы другога полу выкарыстоўваюцца найменні *кахаць, каханне і любіць, любоў: Лепш не шукайце, не сустракайце Тых, што ў юнацтве кахалі* (П.Панчанка). *Люблю цябе, адзіную, да болю, Люблю цябе з гадамі гарачэй* (С.Грахоўскі). *Хай ад кахання я згару ў агні, – Узаемнасці я не маю, Ані!* (Э.Валасевіч). *Агонь маёй любві яшчэ не згас, Хоць без цябе я сэрцам халадзею* (У.Верамейчык). *Любоў у сэрцы не згасала Да той адзінай, дарагой* (А.Бялевіч).

У асобных выпадках гэтыя словы ўжываюцца ў межах аднаго мікракантэксту з мэтай размежавання іх розных сэнсавых адценняў, канцэнтрацыі ўвагі на працягласці працякання гэтага пачуцця, рознай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ступені яго выяўлення: *З гадамі* ***каханне*** *праходзіць, Навек застаецца* ***любоў*** (С.Грахоўскі). *Я забываюся слова* ***любоў****, каб* ***каханне*** *не страціла сэнсу ні каліва* (А.Гуцаў). *Святое сэрца, што* ***кахала*** *мяне, Не аддам бруду. А* ***любіць*** *усё, што хаця і міне, Да канца буду* (К.Кірэенка). ***Люблю*** *маладых І* ***люблю*** *пасівелых, Вясёлых* ***люблю****, А* ***кахаю*** *адну* (С.Грахоўскі). *Не, яна не проста была* ***ўлюбёна*** *ў гэтага дужага, разумнага, таленавітага чалавека. Яна* ***кахала*** *яго, глыбока, тайна, безнадзейна* (І.Шамякін). *Я ўдзячны, што ты ёсць. З табой спазнаю вечнасць.* ***Люблю*** *за прыгажосць,* ***Кахаю*** *за сардэчнасць* (Л.Пранчак).

Шырокае па сэнсавым аб'ёме і значнасці слова *любоў*, арганічна злітае з іншыміі словамі ў кантэксце Яўгеніі Янішчыц, дазволіла паэтэсе смела заявіць, што ў аснове ўсяго жывога на зямлі — любоў, што без яе немагчыма чалавечае існаванне:

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды.
Пачынаецца ўсё з любві —
Нават ненавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві,
А інакш і жыць немагчыма.

Слова *каханне*, засведчанае ў помніках старажытнага беларускага пісьменства пачатку XVI ст., лічыцца запазычаннем з польскай мовы. Словы *любоў, любіць, любы* з'яўляюцца праславянскімі, ужываюцца ва ўсіх славянскіх мовах.

Назоўнік *каханне* па семантыцы больш спецыялізаваны (у параўнанні са словам *любоў*) і, як правіла, выражае інтымнае і глыбокае пачуццём да іншага чалавека. За словам *любоў*, якое ў адным са сваіх значэнняў выступае ў якасці сіноніма да слова *каханне*, замацаваліся іншыя значэнні і адценні. Гэта пачуццё глыбокай прыхільнасці да каго-, чаго-н., адданасці каму-, чаму-н. *(любоў да маці, бацькоў, дзяцей, да свайго народа, роднай зямлі, Радзімы)*, цікавасць, схільнасць, цяга да чаго-н. *(любоў да мастацкага слова, паэзіі, музыкі, да калекцыяніравання, падарожжаў)*. Любоў таксама можа выяўляцца ў дачыненні да прыроды, кветак, птушак, сваей гісторыі, да ісціны, дабра, справядлівасці, навукі, свабоды, жыцця, да багацця, славы, улады, грошай і мн. інш. Слова *любоў*, такім чынам, выступае ў якасці гіпероніма (мае больш шырокае, родавае, абагуленае значэнне) у дачыненні да слова *каханне*, якое характарызуецца больш вузкім, спецыялізаваным, гіпанімічным значэннем .

Значэнне слова *каханне* 'вялікае сардэчнае пачуццё да пэўнай асобы другога полу', у якім увага акцэнтуецца на шчырасці і сардэчнасці пачуцця, складае толькі маленькую частку шырокага і аб'ёмнага па семантыцы паняцця. Па-за межамі дэфініцыі засталіся дыялектычная складанасць кахання, яго мнагапланавасць, глыбіня, сіла, працягласць, аксіялагічная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неадназначнасць і многае іншае, аб чым у пэўнай ступені сведчаць шматлікія азначэнні-эпітэты: каханне можа быць *бессмяротным, бязмежным, бясконцым, вечным, неўміручым, доўгачаканым, бурлівым, бязмерным, невычэрпным, усёпаглынальным, высакародным, высокім, вялікім, моцным, гарачым, глыбокім, непахісным, нясцерпным, палкім, чыстым, шчаслівым, шчырым, прыгожым, пяшчотным, радасным, светлым, неспадзяваным, нечаканым, нязвыклым, неакрэсленым, летуценным, таемным, самотным, сарамлівым лёгкім, нядоўгім, кароткім, мімалётным, міжвольным, безнадзейным, бязрадасным, вымучаным, выпакутаваным, горкім, журботным, непадзельным, нярадасным, няшчасным, пакутным, пякельным, раўнівым, ахвярным* і мн. інш. [Гаўрош, с. 204-205].

Безумоўна, усе гэтыя азначэнні складаюць толькі частку шырокай семантычнай палітры слова *каханне*. Любоўнае пачуццё ўяўляе з сябе складаны комплексны феномен. Гэта адзін з важнейшых модусаў чалавечага быцця, які характарызуе чалавека як сацыяльную істоту, пэўным чынам звязаную з іншымі людзьмі. Каханне лічыцца лінгвакультурным канцэптам, які разам з канцэптамі шчасце, вера, надзея, свабода ўваходзіць у лік светапоглядных універсалій, адносіцца да базавых жыццёвых каштоўнасцей і непасрэдна ўдзельнічае ў фарміраванні ў чалавека сэнсу жыцця [Варкачоў, с. 8]. Вытокі кахання, на думку М.Ц.Кузняцова, у прыродзе чалавека, яго існаванні, пачынаючы ад генетычнай зададзенасці і прызначэння і завяршаючы сацыяльнай арганізацыяй чалавека ў грамадстве [Кузняцоў, с. 19].

Шматлікія вызначэнні кахання адлюстроўваюць мнагамернасць гэтага феномену. Каханне лічыцца рэлігійным пачуццём, псіхалагічным станам, глыбокім інтымным пачуццём, біялагічным (палавым) інстынктам, суб'ектыўным, перажываннем, відам камунікацыі… Звязанае з адносінамі блізкасці, агульнасці паміж людзьмі, імкненнем да духоўнага і фізічнага аб'яднання, каханне мае даўнюю традыцыю аксіялагічнага апісання. Яно застаецца аб'ектам пільнай увагі з часоў Платона да нашых дзён і вывучаецца ў філасофіі, тэалогіі, псіхалогіі, фізіялогіі, культуралогіі, сацыялогіі і іншых навуках. Былі прапановы вылучыць галіну ведаў пра каханне і любоў у асобную дысцыпліну пад назвай амуралогія [Рурыкаў, с. 22; Кузняцоў, с. 13]

Вялікую колькасць тыпалогій і азначэнняў кахання, якія прапануюцца рознымі аўтарамі, можна было б прадаўжаць і далей. Каханне лічыцца формай духоўнай культуры, сацыяльна-культурным феноменам, адным з асноўных канцэптаў, якія выражае непасрэднае, глыбокае і інтымнае пачуццё чалавека да іншага чалавека. У кнізе споведзяў вядомых людзей Беларусі «Шчыра, як на духу» (Мн., 2002) адказы на многія пытанні так ці інакш былі звязаны з каханнем і любоўю: *шчасце, шчаслівае жыццё* – гэта любіць і быць любімай (С.Акружная), калі ты любіш і цябе любяць (В.Глушакоў), калі ёсць любімая праца і каханне (Р.Гарэцкі), *самы радасны момант у жыцці* – гэта час кахання (С.Алексіевіч), калі пакахаў сваю будучую жонку (І.Шамякін), калі сустрэў тую адзіную, аб якой марыў (В.Шаранговіч), *сямейнае шчасце* – гэта дружная сям'я з каханнем і павагаю (Л.Асецкі), узаемаразуменне і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўзаемнае каханне (Г.Бураўкін), узаемаразуменне і ўзаемалюбоў (Л.Яўменаў), калі шлюб па каханню (В.Глушакоў), гэта разумець адно аднаго і любіць (С.Законнікаў), каханне на ўсё жыццё і дзеці (І.Шамякін).

*«Каханне – вельмі складаная рэч»,* – так думаюць многія людзі. Рытарычныя адказы на гэта пытанне з жыццясцвярджальнымі фінальнымі словамі дае Р.Барадулін: *Што ёсць каханне? Бессаромнасць, Ці сціпласць, Што не ўздыме воч, Ці разгаўленне, Ці скаромнасць, Ці ў зорках дзень, Ці ў сонцы ноч? Ці вечны грэх, Ці пакаянне, Ці сум цяжкі, Ці весялосць? Пакуль не стоміцца Пытанне Пытаць, Датуль каханне Ёсць!* У зборніках вершаў Генадзя Бураўкіна «Пяшчота», «Чытаю тайнапіс вачэй» праўдзіва і пранікнёна расказваецца пра загадкавыя таямніцы кахання, горычы расстанняў і радасці сустрэч, пра беражлівыя адносіны да спадарожніц жыцця. Паэт здзіўляецца перад хараством жанчыны, становіцца перад цудам жаночай прыгажосці на калені, выказвае ёй удзячнасць за *“тайнапіс вачэй”,* за *“святыя хвілі радасці жывой”,* за *“душ яднанне”.* Падслухаўшы самыя патаемныя словы закаханых, Генадзь Бураўкін змог выказаць вечныя ісціны, якія сёння ўспрымаюцца як афарызмы: *Жыццё было б пустым і вартым спачування, Калі б на свеце не было кахання; Не, без кахання я не пражыву, Не пражыву я без цябе ніколі; Зямное непаўторнае каханне Адно на двух нам даў шчаслівы лёс; Нам ніколі замнога не было на дваіх І кахання зямнога, і трывог незямных; Непрыгожых жанчын не бывае, Проста шмат невідушчых мужчын; Прыцішыцца няма калі Мне на жыццёвым перавале. На грэшнай стомленай зямлі Мяне любілі і кахалі.*

У многіх радках беларускіх паэтаў сцвярджаецца, што жыць без кахання – гэта свайго роду грэх, пакаранне: *Няма, напэўна, горай пакарання, Калі не свеціць над табой каханне* (А.Грачанікаў). *Сярод грахоў ёсць самы цяжкі грэх: Жыць на зямлі без ласкі і кахання* (Л.Пранчак). Такое жыццё пазбаўлена сэнсу: *Калі б не каханне, то гэты свет Не меў бы сэнсу і плёну... Свечка без полымя Проста прадмет: Неадушаўлёны* (С.Законнікаў). Шматлікія паралелі «безкаханнага» жыцця з рознымі жыццёвымі рэаліямі прыводзіць Зіновій Прыгодзіч у вершы «Жыццё без кахання»: *Жыццё без кахання – як дзень без світання; як кубак без брагі пеністай, хмельнай; як стол без гасцей і без песняў вяселле; як дрэва без квецені буйнай, вясновай; як поле без грэчкі духмянай, мядовай; як ранішні лес без цымбалаў птушыных; як лета без кветак пажару маліны; як зямля без вясны, без сонечнага дыхання – чалавек без кахання.* Фактычна, не любіць – значыць не жыць.

Каханне называюць здольнасцю ахвяраваць сабою дзеля каханага; уменнем аддаваць і не браць; жаданнем зрабіць любімага чалавека шчаслівым; крыніцай усяго найлепшага і ўзвышанага; энергіяй жыцця; узнагародай, атрыманай без заслуг; хваробай сэрца; гульнёй у карты; прывідам; трывалай звычкай; вогненнай ракой; інтымным палавым пачуццём; асновай і мадэллю сусвету... Шэраг азначэнняў кахання можна доўжыць, і ўсе яны не вычарпаюць тую вялізную палітру значэнняў, адценняў і сугуччаў гэтага вялікага па сэнсавым аб’ёме слова. «У любові тысячы аспектаў, і ў кожным з іх – свой свет, свой смутак, сваё шчасце і свая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

духмянасць», – пісаў К.Паустоўскі. І з гэтым выказваннем нельга не пагадзіцца.

Канцэптасфера кахання адлюстроўвае як асабісты вопыт суб’екта, так і калектыўны вопыт народа, яго менталітэт. Нацыянальна-культурная спецыфіка асабліва ярка выяўляецца ў парэміялагічных тэкстах (прыказках і прымаўках), дзе часцей за ўсё ўвага акцэнтуецца на складанасці гэтага душэўнага пачуцця (*Любіць не сена касіць*), яго цэннасці, адданасці закаханых адно аднаму (*Любі другога, як сябе самога. Не шукай красаты,а шукай дабраты*), на непадкантрольнасці пачуцця, немагчымасці яго прымусу (*Сэрцу не загадаеш, каго любіць. Сэрцу не падкажаш. Сілаю не быць мілаю. Насільна мілы не будзеш*), на ўзвышанасці, абагаўленні каханай (*Не піў бы, не еў бы, ды на любую глядзеў бы*), на малады ўзрост закаханых (*Еш з голаду, а любі з моладу*). У асобных выпадках актуалізуюцца негатыўныя аспекты ., звязаныя з асляпляльнасцю каханнння і адсутнасцю цвярозасці розуму, з недаўгавечнасцю кахання, яго цярпімасцю і інш. (*Любоў зла – палюбіш і казла. З вачэй далоў – з сэрца вон. Сцерпіцца – злюбіцца*).

Каханне з’яўляецца асноўным аб’ектам апісання ў літаратуры. Сусветная літаратура стварыла бессмяротную «адысею» кахання. Перагортваючы старонкі твораў Д.Бакачыо, Ф.Петраркі, Ш.Бадлера, У.Шэкспіра, А.Стэндаля, А.Пушкіна, І.Тургенева, Л.Талстога, Ф.Дастаеўскага, М.Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа і сучасных пісьменнікаў, можна ўявіць гісторыю развіцця, спецыфіку выяўлення гэтага пачуцця і, безумоўна, тую адзіную, дзяля якой ствараліся творы, гаварыліся самыя цудоўныя і ўзвышаныя словы. Гэта Дантэ і яго Бэатрычы, Пэтрарка і Лаура, М. Багдановіч і яго Вераніка, Янка Купала і Паўлінка, А. Куляшоў і Алеся... Тэме кахання прысвечаны кнігі «Пяшчота» і «Чытаю тайнапіс вачэй» Г.Бураўкіна, «Каханне» Р.Баравіковай, «Біблія для каханай» Л.Пранчака, «Першы пацалунак» С.Законнікава, «Калыханка для каханай» М.Адама, «Каханне і воля» Х. Гурыновіча, «Калі б не ты» З.Прыгодзіча, «Каралева прыйдзе ноччу» Л. Сом, а таксама калектыўныя зборнікі «Зорка Венера», «Яна і Я» і мн. інш.

Каханне – гэта крыніца радасці і лепшых імкненняў чалавека, пачуццё бязмернай павагі да жанчыны, яе харства, прывабнасці, душэўнай чысціні. У беларускай літаратуры нямала твораў, гераіні якіх, праходзячы праз цяжкія выпрабаванні, захавалі на ўсё жыццё першае нясмелае юнацкае пачуццё. Каханне Алеся Загорскага і Міхаліны Раўбіч (раман У.Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім») дапамагае героям перанесці ўсё цяжкасці жыцця, пераадолець спакусы лёсу і застацца вернымі самім сабе і ўзаемнаму любоўнаму пачуццю. Адным з яркіх прыкладаў можа служыць каханне Адама Міцкевіча да Марылі Верашчакі, якое кардынальна змяніла жыццё геніяльнага паэта. кінула яго ў вір глыбокіх перажыванняў. Паэт навекі ўвасобіў каханую як ідэал высокай і чыстай прыгажосці, які на ўсё жыццё стаў яго пуцяводнай зоркай. Каханнем стагоддзя назвала К.Я.Шышыгіна-Патоцкая рамантычныя і ўзнёслыя адносіны Барбары Радзівіл і Жыгімонта Аўгуста [Шышыгіна-Патоцкая]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А хіба можа не кранаць лёс Ядвісі з трылогіі «На ростанях» Я.Коласа, Ганны з «Палескай хронікі » І.Мележа, Марысі з паэмы «Хамуціус» А.Куляшова, Сашы Траянавай з «Трывожнага шчасця» І.Шамякіна? Сімвалам кахання ў рамансе М. Багдановіча «Зорка Венера » становіцца самая яркая зорка на небасхіле – Венера. Герой твора засмучаны тым, што павінен расстацца з любай дзяўчынай. Ён абяцае, што ўсё сваё жыццё будзе помніць каханую. Пра яе будзе напамінаць і Венера, якой, безумоўна, вядома пра пакуты разлучаных сэрцаў.

Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.

Каханнне – неад’емная частка чалавечага жыцця – індывідуальнае і непаўторнае, выяўляецца ў шматлікіх формах і іпастасях. З-за сваёй прыцягальнасці і пастаяннага магнітнага цягацення яно лічыцця жыццёвай цэннасцю, асновай жыцця. «*Каханне — гэта падмурак, на якім усё стаіць,* — разважае Алесь Камоцкі. — *І ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Для мяне асабіста каханне вызначаецца значна шырэй, чым проста адносіны паміж мужчынам і жанчынай. Бо каханне — гэта жыццё*». І з гэтым нельга не згадзіцца, бо каханне напаўняе жыццё сэнсам, вучыць жыць не дзеля сябе, а дзеля іншага. Каханне – гэта цудатворная сіла, здольная запаліць святло ў самых патаемных кутках душы, гэта жыццёвы компас, цуд, крыніца сіл, крылы для палёту. Яно даражэй за ўсе скарбніцы: *Каханне – зарука вечнасці жыцця* (Г.Бураўкін). *Каханне – лепшы компас у жыцці, Бо нельга без яго знайсці кірунак,... гэта моцны рухавік жыццёвы* (А.Балуценка). *Каханне наша – крылы, Каб узляцець вышэй* (Г.Атрошчанка). *Крылы – наша каханне* (Х.Гурыновіч). *Твая любоў гарачая — Крыніца сіл маіх* (Я.Непачаловіч). *І каханне тваё я ўспрымаю як цуд, Што асвеціць жыццё і надзеліць трываннем, І пазбавіць мой лёс ад нягод і пакут* (Л.Пранчак). *Каханне--святло невядомае зоркі* (Л.Дранько-Майсюк). *Мяне на зямлі, як малітва, трымае Неабдымнае неба кахання твайго* (З.Марозаў).

Сапраўднае каханне напаўняе жыццё светам, радасцю, дапамагае жыць, змагацца і перамагаць: *Веру — Лягчэй пры нагодзе любой Цяжар гадоў нам трымаць на плячах, Покуль ідзе з намі поруч любоў, Покуль і ў сэрцы вясна І ў вачах* (А.Зарыцкі)*:* Яно, на думку рускага пісьменніка І.Тургенева, мацней за смерць і страх смерці. Аб непераможнасці кахання, яго надзвычайнай сіле сцвярджаецца ў наступных радках: *Каханне ёсць, у каханні сіла, Яно з табой на ўсё жыццё, Жыццё каханне нарадзіла, І толькі смерць мацней яго!* (А.Кельмуц). *Каханне... растопіць ільды асцярогі і вызваліць скрытыя воды* (А.Бадак).

Пры вызначэнні сутнасці кахання даволі часта выкарыстоўваюцца дэфініцыі карытатыўнага характару, якія актуалізуюць такія семы, як бескарыслівасць, міласэрнасць, гатоўнасць дараваць і прыносіць радасць, нічога не патрабуючы ўзамен. *«Кахаць - гэта знаходзіць у шчасці другога сваё ўласнае шчасце»,* – пісаў Г.Лейбніц. Такое каханне кіруецца маральнымі прынцыпамі і прадугледжвае любіць чалавека такім, якім ён ёсць на самой

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

справе. У яго аснове – гармонія паміж людзьмі, духоўны рост чалавека, магчымасць яго далейшага раскрыцця і ўдасканальвання: *Сапраўднае каханне ёсць ахвярнасць, прынясенне ў дар самога сябе* (У.Клімовіч). *Каханне трэба берагчы ад наносаў дробнага самалюбства* (К. Кірэенка). *Каханне – гэта калі ты ўвесь час думаеш пра аднаго чалавека, і гэтыя твае думкі — самае галоўнае і асноўнае, незалежна ад нейкіх тэрміновых спраў і абавязкаў* (Л.Сом). *А каханне без павагі – не каханне* (У.Карпаў)

Да ліку складальнікаў любоўнага пачуцця адносяць радасць і шчасце. Улюбёныя радуюцца адзін аднаму і радасцям кожнага. Яны шчаслівыя шчасцем сваіх каханых: *Мы – дзве ракі, напоўненыя шчасцем, мы – дзве рукі, што мкнуцца ў вышыню* (М.Федзюковіч). *Каханне – гэта шчасце, якога хопіць на ўсё жыццё* (Г.Бураўкін). *Першае каханне – гэта радасць, шчасце, казка, сон* (А.Балаценка). *Мне радасць цябе кахаць, Мне шчасце з табою быць* (Л.Пранчак). *Там любоў, дзе радасць Правіць цэлым светам Ад твайго пагляду* (Т.Бондар).

У асобных выпадках каханне інтэрпрэтуецца як лёс, наканаванне, прадвызначанасць: *Мы прымем каханне пакорна, Як лёс ці як божую ласку…*(Л.Пранчак). *Каб і хацелі, мы б не размінуліся, Бо лёс даўно ўсё вырашыў за нас* (У.Шпадарук). *І ёсць каханне ў гэтым свеце, Яно нікога не міне…* (Л.Дранько-Майсюк)

Многія характарыстыкі кахання звязаны з выяўленнем часу існавання гэтага пачуцця, яго працягласці. У каханні, на думку многіх, адсутнічае статычнасць. Гэта пачуццё можа ўзнікаць, пэўны час існаваць і знікаць, што залежыць ад умення і здольнасці чалавека любіць, ад яго прыроднага і ўзроставага рэсурсу (на сапраўднае працяглае каханне, кажуць, здольныя літаральна адзінкі). *«Нас маладосць адорвае каханнем, каханне нас вяртае ў маладосць»,* – піша Раіса Баравікова, падкрэсліваючы вялікую роль кахання ў падтрымцы жыццёвых сіл і энергіі чалавека ў яго сталыя гады, калі эмацыянальная прывязанасць умацоўваецца. *«Каханню ўзросты ўсе пакорны, Хоць у палоне тым не ўсе!»,* – акцэнтуе ўвагу на выбіральнасці кахання Алесь Звонак. «Каханне праходзіць, і на яго змену прыходзіць новае і свежае прачуццё », – зазначаюць лірычныя героі вершаў Аркадзя Куляшова і Кастуся Цвіркі: *Прайшла любоў, прыходзіць муза, Святлее розум, гіне тлум. Я вольны, прагну зноў саюза Чароўных гукаў, мар і дум* (А. Куляшоў). *Я прыйшоў да вас, каб сказаць, Што не раз можна ў свеце кахаць: Хоць любоў на зямлі адна, Паўтарыцца можа яна* (К.Цвірка).

Тэмпаральныя азначэнні кахання можна размеркаваць па дзвюх групах. У першай актуалізуюцца семы ‘кароткачасовасць’, ‘хуткабежнасць’, ‘маланкавасць’: *Каханне – час цудоўнага цвіцення, **Імгненна** прабягае дзіўны час, Яго падоўжыць цепліцца імкненне, Ды адцвітаюць кветкі хутка ўраз* (А.Балуценка). *Як золата восеньскіх дрэў – Каханне на свеце не вечна* (Л.Пранчак). *О, **міг любві**, не адпалай дачасна. Нібы касцёр, пачуцці ўзварушы!* (М.Мятліцкі).

Тэмпаральны паказчык другой групы звязаны з характарыстыкай кахання як сталага, бессмяротнага пачуцця. Калі каханне ўзаемнае, то для

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

закаханых перастае існаваць час, і гэты момант як бы пераходзіць у вечнасць. Каханне – не хвіліннае пачуцце, а вечнае жыццё, якое прадаўжаецца ў наступных пакаленнях і робіць жыццё чалавека часткай бясконцага жыццёвага кантынууму: *Ёй [любові]* ***век гарэць і не згарэць*** *датла, Ёй* ***век цвісці****, не знаўшы адцвітання* (А.Звонак). *І ўсё ж* ***нямеркнучай была*** *Сярод усіх вякоў, Як прыклад сонца і святла, Вялікая* ***любоў*** (М.Хведаровіч). *Агні кахання —* ***вечныя агні****. Яны нікому з нас не слепяць вочы* (А.Грачанікаў). *Каханне –* ***вечная вясна*** *паэтаў* (У.Скарынкін). Эдуард Валасевіч праводзіць антытэзу «згаснуць зоркі – не згасне каханне» і тым самым сцвярджае ідэю вечнасці кахання: *Зоркі згаснуць на світанні, Толькі* ***полымя кахання*** *Не пагасне у вачах тваіх*.

Філасофскія разважанні пра нязначны па часе зямны шлях чалавека, пра пэўную наканаванасць кахання ў лёсе кожнага чалавека гучаць у радках верша Генадзя Бураўкіна, насычанага экзістэнцыяльнымі антонімамі і вобразнымі метафарамі: *Мы ўсе праходзім поўны* ***круг жыцця*** *— Ад першых слёз Да сціхлага дыхання, Адпіўшы* ***чашу хмельнага кахання****, Адчуўшы колкі* ***холад забыцця.***

Сталі амаль традыцыйнымі даволі распаўсюджаныя ў мове канструкцыі з аксюмаранамі, у якіх адначасова выражаецца і вечнасць, і імгненнасць кахання: *каханне – гэта вечнае імгненне; каханне – часовая з’ява вечнасці; каханне вечнае, але жыве кароткі час.*

Каханне, як вядома, мае свае законы развіцця, свае ўзросты: рамантычную вясну, гарачае лета, раннюю ці познюю восень і суровую зіму. Запал, вялікая сіла кахання найчасцей перадаецца праз метафарычныя значэнні полісемантаў *агонь, вогнішча, полым, касцёр, жар.* Першаснае значэнне такіх слоў звязана з працэсам гарэння, і рэакцыя сэрца і душы нагадвае рэакцыю цела на агонь, гарачыню. *«Каханне наша, як пажар. Але ніхто яго не тушыць. Шугае полымя да хмар І спапяляе жарам душы»,* – зазначае Леанід Пранчак. Пры метафарызацыі дадаткова актуалізуюцца квантытатыўныя семы ‘моц’, ‘вялікая сіла выяўлення’, ‘уздым’: *А цяпер вось* ***кахання агню*** *Аддаеш пачуццё ты і сілы* (У.Жылка). *Вы распалілі* ***вогнішча*** *ўва мне, Яно гарыць, і я ў ім дагараю* (Р. Барадулін) *Зоркі згаснуць на світанні… Толькі* ***полымя кахання*** *Не пагасне у вачах тваіх* (Э.Валасевіч). ***Пачуцці****, якія доўга* ***гарэлі*** *ў глыбіні душы асобнымі іскрамі, успыхнулі ў тую хвіліну вялікім* ***полымем*** (І.Шамякін). *Той касцёр не з полымя і дыму, той* ***касцёр*** *з пачуццяў і суніц* (У.Гетманчук). *Толькі сэрца ў цемрыве стыне: Там гарыць майго* ***кахання жар*** (Я.Золак).

Вялікае пачуццё ўскалыхвае душу чалавека, прымушае яе бурліць, хвалявацца. Таму параўнанне такога пачуцця з бурай, віхурай, штормам і іншымі прыроднымі з’явамі разбуральнага характару ў літаратурных творах лічыцца традыцыйным: *Любоў — гэта* ***смерч****,* ***ураган*** (А.Зарыцкі). *Здавалася, ужо забыўся, плюнуў на яе [Іну]. А ўбачыў — зноў* ***бура*** *ўзнялася ў грудзях, разгарэўся* ***агонь*** (М.Ваданосаў). *Нечакана выбухне аднойчы і захлісне* ***віхура пачуцця*** (Р.Баравікова). *Гатоў цябе я ўсю скусаць, — Усціш маіх настрояў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***шторм*** (Я.Пушча). *Пайшла нават Свіслач **бурліваю плынню,** – Юнак у каханні прызнаўся дзяўчыне* (А.Александровіч).

Многія пісьменнікі даволі часта выкарыстоўваюць прыём паслядоўнага нанізвання метафар і іншых вобразна-выяўленчых сродкаў, у выніку чаго ствараецца панарамы малюнак-апісанне, у якім падкрэсліваюцца самыя разнастайныя нюансы высокага пачуцця, шматлікія аспекты яго выяўлення: *Каханне — гэта **полымя, агонь жыцця, тварэнне цуду*** (Г.Юрчанка).

Прыём нанізвання метафар дазваляе акрэсліць не толькі характар пачуцця, але і перадаць абставіны і ўмовы яго выяўлення. Стоенасць, працяглая стрыманасць пачуцця і яго бурлівае выяўленне Алесь Бачыла выражае спалучэннем слоў у прамым значэнні і метафарычных субстантываў *дамба страсці, паводка жыцця: Колькі ж стоенага пачуцця **Дамба страсці** тваёй стрымала! І якая **паводка жыцця**, Як плаціну, яе прарвала?*

Пачуццё закаханасці, улюбёнасці ахоплівае душу і сэрца чалавека (асабліва маладога) часам раптоўна, знянацку. Сяргей Давідовіч паказаў гэту раптоўнасць праз вобразы-метафары *вулкан жыцця, бездань пачуцця*, а таксама дзеяслоўныя метафары *апячы, захапіць*: *Раптам — апякло дыханне, захапіў **вулкан жыцця**: на дваіх — адно каханне, вось і **бездань пачуцця!***

Аб нечаканасці з’яўлення кахання, яго імгненнасці пішуць Ю.Свірка і Л.Пранчак: *Вось так прыходзіць першая любоў, Нібы паводка, **бурна, нечакана*** (Ю.Свірка). *Мо пад вечар, Мо праз вечнасць Мы сустрэнемся з табой. І **аслепіць** нас каханне, **Як маланка** над ракой* (Л.Пранчак).

Паэтычны дыскурс сведчыць, што каханне ўспрымаецца супярэчліва. Яно можа не толькі узвышацца і рамантызавацца, але і прызямляццца: *Каханне і прынізіць, і.. узніме, Пакуль у ім жывае душа мая* (Р.Баравікова). Аб складанасці кахання, яго амбівалентнасці, дваістасці сведчаць шматлікія прыклады, у якіх процілеглыя пачуцці, узнёслыя і прыземленыя парывы, перадаюцца адначасовым выкарыстаннем антонімаў *любоў – нянавісць, радасць (шчасце) – гора (пакуты, боль, слёзы), горыч – слодыч, мёд – палын, свабода – няволя*: ***Кактэйлі любові з нянавісцю** — звычны сучасны пакой. Дзе вы, былыя страсці, няма ні той, ні другой* (П.Шруб). *Бо каханне – з **радасці** і **слёз**, **Шчасце**, перамешанае з **горам*** (А.Балуценка). *Востраў тугі і кахання… І **горыч**, і **слодыч** кахання* (А.Мара). *У каханні ёсць **радасці**, **пакуты** і слёзы… У кахання няма аданаго – перамог* (С.Законнікаў). *Прыйшло каханне, а разам з ім і яго неразлучныя спадарожнікі: **шчасце** і **пакуты*** (Э.Васілевіч). *На схіле веку тлумна-злога І **мёд** спазнаўшы, і **палын**, Я зразумеў, як гэта многа, Калі ты ў свеце не адзін* (А.Пісьмянкоў). *Каханне – і **свабода і няволя, Крыніца смутку, радасці і болю*** (С. Грачанікаў).

Гімн каханню і маладосці праспяваў Пятрусь Броўка ў невялікім па памеры і вядомым многім вершы «Пахне чабор». Вобраз дзяўчыны «ў белай іскрыстай хусцінцы» кліча і вабіць паэта, як само юнацтва, бо па-маладому ярка выяўлена разнастайная гама пачуццяў: і ўспаміны аб даўнім, беззваротным юнацтве, і першае каханне, што апаліла душу героя, і прыгажосць чыстай душы, яе рамантычная ўзнёсласць, і юнацкая нерашучасць, і боль страты, і дакор сабе:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Час той схаваўся за дальняй гарою,
Здасца хвілінай — яна прада мною...
Выйду. Гукаю. Маўклівы прастор.
Пахне чабор.
Пахне чабор...

Дарэчы, сувязь кахання і каханай з пэўнымі раслінамі, травамі і дрэвамі – нярэдкая з’ява ў беларускай і сусветнай літаратуры. Лірычнаму герою Петруся Броўкі пра першае незваротнае пачуццё нагадвае чабор, героям Генадзя Бураўкіна і Уладзіміра Верамейчыка – верас: *На далёкай юначай вярсце Сіні* ***верас****, бахматы* ***верас*** *І сягоння яшчэ цвіце* (Г.Бураўкін). *На* ***узбярэжжы*** *нашага* ***кахання*** *Гараць агнём блакітным* ***верасы*** (У.Верамейчык). Першае каханне для Уладзіміра Клімовіча – гэта ружа-кветка. Сімвалам кахання для коласаўскай Ядвісі стала груша, якую гераіня твора сама *“надламала”*. Вонкавая, бачная кожнаму прыгажосць мележаўскай Ганны параўноўваецца з рабінай: *«... ціхая, нявідная, у жнівеньскім росквіце рабіна заружавела, зазырчэла яркім, кідкім хараством, гарачым полымем агністых гронак. І не адны вочы, не абыякавыя, не ачарсцвелыя ў жыццёвых пакутах да хараства, глядзелі здзіўлена, зачаравана: “Глядзі ты!..” Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна».* Нетрадыцыйнае спалучэнне слоў *дрэва кахання* сёння ўспрымаецца як трывалая метафара-сімвал, якая разумеецца крыху па-рознаму, але абавязкова ў суаднесенасці з моцным, непераходным пачуццём: *Песня радасці і болю, Незабыўнага спаткання, – Хай красуюць над зямлёю* ***Дрэвы*** *нашага* ***кахання*** *(*М.Пазнякоў). *А я спрабаваў ссячы тонкае* ***дрэўца кахання*** (П.Шруб).

Унікальнасць кахання ў яго непасціжным шматабліччы, якое можа нагадваць вечнае мігценне зорак, зыб на паверхні вады, трапятанне лістоў на дрэве, полымя агню… Самыя нечаканыя азначэнні кахання, шматлікія яго паралелі і суадносіны можна знайсці ў паэтычным лексіконе многіх пісьменнікаў. Каханне для Паўлюка Пранцузы — *першы ветразь у вясну трывожных год,* для Нічыпара Чарнушэвіча — *надзей лавіна,* для Рыгора Барадуліна – *выспа сноў,* для Васіля Гадулькі – *светлы сон душы,* для Анатоля Грачанікава –*гэта круг, і радыус яго — як свет, бясконцы. «Любоў мая, ты скрыпка, і цымбалы, І шаргункі — над грывамі гадоў»,*– усклікае Яўгенія Янішчыц. *«Каханне – гэта натхнення сакаліны ўзмах,.. каліны прысмак на губах»,* – лічыць Генадзь Бураўкін. *«Каханне – пачуцця святога азарэнне, чалавецтва светлае вясло»,* – зазначае Леанід Якубовіч, вылучаючы ў гэтым пачуцці высокі свет азарэння.Часам каханне параўноўваецца з віном, любоўнай ап’янеласцю ад такога напітку: *Я зберагу* ***віно кахання*** *У кубку стомленай душы* (З.Марозаў). *Пабудзь са мной. Яшчэ не выпіты кілішак, яшчэ* ***напой кахання*** *нашага не выйшаў увесь да дна* (М.Адам). *Атручан хмельным* ***соладам кахання*** (У.Жылка).

У шырокім і даволі разгорнутым спектры пачуццяў, звязаных з каханнем, ёсць паласа, не кранутая сонечнымі промнямі па прычыне страты гэтага высокага пачуцця, згубы, здавалася б, вечнай сіняй птушкі кахання. Каханне прыходзіць і адыходзіць без волі чалавека. Нераздзеленае пачуццё часта прыносіць боль, моцную тугу, смутак, часам страту ўпэўненасці у сэнсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

жыцця. З сучасных паэтычных твораў можна стварыць цэлы «дыскурс самоты», у якім адлюстраваны боль і горыч аб страчаным каханні, незабыўны ўспамін пра шчаслівыя часы. Ціхую і шчымлівую мелодыю расставання стварыў Аркадзь Куляшоў у вершы «Бывай»:

Бывай, абуджданая сэрцам, дарагая.
Чаму так горка, не магу я зразумець.
Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае
На ўсходзе дня майго, якому ружавець.

Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманы,
Палынны жаль смугой ахутаных дарог,
Каб я хвілінны боль і горыч гэтай раны
Гадамі ў сэрцы заглушыць сваім не мог.

У паэтычным дыскурсе нямала разважанняў пра страту той нябачнай ніці, што некалі звязвала людзей, пра стан адзіноты, спустошаную душу: *Ты аддаляешся, ты аддаляешся, Ад пацалункаў маіх вызваляешся, Ад непатрэбнай нікому маны, Ад недарэчнай уласнай віны. Хто мы? Чужыя адно аднаму…* (А.Бадак). *І зноўку адзін, нібы палец. У клетцы зажураных сцен Жыве неспатольная памяць, Як прывід, як здань, што ні дзень* (Э.Зубрыцкі). *А калі цябе не бачу, Калі ты са мной не побач, – Мне тады ўсё нялюба, Мне тады – адны пакуты…* (З.Прыгодзіч).

Чалавек без сваёй каханай пераўвасабляецца, можа стаць драпежным зверам, кінутай птушкай, калодзежам без вады, вадой без рэчышча… Стан адзіноты і разгубленасці ў паэтычных радках часцей за ўсё перадаецца метафарамі са спалучэннем «без цябе»: *Без цябе я самотны і дзікі, Як* ***кінуты птах са зламаным крылом*** (З.Прыгодзіч). *Я –* ***драпежны разгневаны звер*** *– Без усмешкі тваёй сарамлівай* (Л.Пранчак). *Я без цябе –* ***без рэчышча вада,*** *Якой ніколі не сустрэцца з морам* (П.Макаль). *Ты чамусьці пайшла, і я стаў* ***калодзежам без вады,*** *стаў вясновым* ***кустом без лісця****, але болей за ўсё стаў падобны на* ***клетку,*** *якую пакінула птушка…* (М.Стральцоў).

У паэтычных радках могуць актуалізавацца негатыўныя семы, звязаныя з характарыстыкай кахання як болю, пакуты (асабліва, калі яно прайшло, мінулася): *Каханне – боль, нясцерпны боль Датуль, пакуль яно – каханне!* (Л.Пранчак). *Каханне – найцяжэйшая з пакут. Мая добраахвотная пакута* (А.Грачанікаў). *Усё пекла я зведаў кахання, Усе мукі яго скаштаваў* (Я.Купала). *Нам сталі скрухай пацалункі – мы развіталіся ў журбе... Хаваю боль свой… Хаваю боль… Боль…* (А.Масарэнка). *І бяссонніцаю зваўся боль. І была бяссоніцай любоў* (Я.Янішчыц). *Я думаў, што каханне – пакуты, якія немагчыма перажыць* (Г.Бураўкін). *Я твой сум, а ты мой боль* (Л.Пранчак). Некаторыя лірычныя героі вершаў успрымаюць каханне як хваробу, ад якой чалавек губляе сон і апетыт, аддаляецца ад сяброў і знаёмых: *Каханне — смяротная хвароба* (А.Камоцкі). *Я вар'яцею ад цябе, Таму што я цябе кахаю* (Л.Пранчак). *Дыягназ хваробы маёй адвечны: каханне, разлука, журба* (З.Прыгодзіч). І ад гэтай хваробы, на думку З.Прыгодзіча, не існуе лекаў: *Ад стыхіі ж гэтай боскай, уладарнай Лекаў не існуе, знаю, ні ў каго* (З.Прыгодзіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Няшчасная любоў, якая прыносіць боль і пакуты, у асобных творах асацыіруецца з астрогам, турмой: *Каханне –* ***астрог****. Мы казалі, а чулі не мы. О,* ***кахання астрог****!.. Кожны дзень я Вырываўся з цябе, як з* ***турмы****.І з* ***астрожным*** *кляймом на ілбе Я шукаў сабе волі ў гульбе, У абдымках спустошанай стомы І чужы, сам сабе не знаёмы, Я штоночы вяртаўся ў цябе, Як вяртаецца магма ў разломы* (У.Някляеў). Свайго роду рамантызацыя негатыўных перажыванняў і гора, гатоўнасць да самаахвярнасці і здольнасці несці гэты «крыж пакут» да канца жыцця выказваюцца ў наступных радках: *І хто сказаў, што наш саюз – палон, Што, нібы крыж, цяжкі і сумны ён? Я ўсё жыццё яго гатовы несці* (Я.Сіпакоў). *Каханне – клетка? Ды такой бяды – Хутчэй туды, хутчэй хачу туды* (Я.Сіпакоў). *І ты і я – пакутуем удвух, Бо мы – адно суцэльнае чаканне* (В.Собаль). *Мы прыйдзем з табой да кахання Праз боль, перашкоды і мукі* (Л.Пранчак).

*«Ні кропкі, ані мнагакроп'я Не застаецца часам ад кахання»*, – з сумам зазначае У.Шпадарук. Ціхі сум, шкадаванне безваротнага кахання, высокую стрыманасць пачуццяў дазваляюць перадаць метафарычныя субстантывы і канструкцыі тыпу *зіма, халадэча, холад расстання, немата, балючы шрам, патухнуў касцёр* і інш.: *Між намі* ***сцюжнавейная зіма****. Мы іншыя. І ведаем пра гэта* (М.Шабовіч).*Час прамежкавы – некаханне. Час бязлітасны –* ***халадэча*** (Л.Сом). *Глухое маўчанне. Падкрэслены* ***холад расстання*** (Г.Бураўкін). *Мы расстаёмся назусім, Між намі –* ***холад*** *снежных зім…*(Л.Пранчак). *Між табой і мной –* ***немата*** (К.Жук). *Усё вішнёвым снегам занясло, Застаўся ў памяці балючы* ***шрам*** (М.Танк). *І пад цішу Вячэрнюю зор Мой* ***патухнуў*** *У сэрцы* ***касцёр*** (А.Дзеружынскі) *Адгучаў маладосці смех, І кахання* ***касцёр згарэў*** (М.Яцкоў). *Не чую* ***музыкі ў душы****, Што ты вясною абудзіла* (З.Марозаў). *У сэрцы збалелым* ***кахання апошняга жар*** (А.Дэбіш).

Страта кахання ў многіх паэтаў асацыіруецца з памінкамі, свечкай, палыном: *Адгуляла каханне хаўтуры на рамонкавых снах* (М.Адам). *Зоркі ў небе, як свечкі На* ***памінках кахання*** (М.Пазнякоў). *Таму ці варта плакаць над сабою, Над* ***свечкаю*** *былога* ***пачуцця****...?* (Г.Бураўкін).

Каханне, што мінула, засталося толькі ва ўспамінах, можа параўноўвацца з папялішчам, з іржышчам: *На* ***папялішчы кахання*** *знікнуць былыя мары* (І.Хадарэнка). ***Іржышча*** *нашага* ***кахання*** *Бязлітасна абоім раніць сэрца* (Г.Дашкевіч). Безумоўна, не кожны можа з гонарам вытрымаць боль непадзеленага кахання, упэўнена пайсці далей па дарозе свайго жыцця і на развітанне пажадаць любімаму чалавеку шчасця. Мікола Мятліцкі добра разумее, што храм кахання будуюць абое ісуладдзе ў ім залежыць ад абаіх, але часам гэта суладдзе бясследна знікае па віне аднаго з закаханых: ***Кахання храм!*** *Ды дзве сцяжынкі лёсаў пабеглі ў свет у розныя бакі; Я ведаю: збегла ад мужа, Пакінула* ***вернасці дах****.* Часам віна за страчанае пачуццё ўскладваецца на дваіх: *Мо змялела* ***кахання рэчка****, мо заціхлі пачуццяў хвалі? Ціха мірна, без сцэн і спрэчак мы сям'ю напалам ламалі.* (Э.Акулін). Янка Сіпакоў, назіраючы за сучаснай моладдзю, падмеціў пэўную легкадумнасць у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адносінах да любых, паспешлівасць у вырашэнні важных жыццёвых пытанняў: *Імгненная рэакцыя распаду!* ***Раздзел кахання*** *сёння ў модзе: Хоць ёсць яшчэ святло ў паглядах,* ***Каханне — ветах на зыходзе.***

Лірычны герой інтымных вершаў У. Караткевіча «Гісторыя з першым каханнем», «Фантазія», «Раманс аб расстраляным каханні», «Калі памірае каханне» перапоўнены светлым і трывожным пачуццём, болем ад расстання, душэўным сумам, верай у вечнае незямное каханне:

О каханне маё бясконцае,
Не ўцякай ад мяне, пашкадуй!
За табой, як за светлым сонцам,
Па штодзённай дрыгве іду.

Самапагасанне пачуццяў і ўражанняў амаль заўсёды залежыць ад удзельнікаў любоўнага дуэта, ад умення кожнага захаваць светлае пачуццё. Безумоўна, немалаважную ролю ў гэтым адыгрываюць такія фактары, як сумяшчальнасць характараў, узрост, адносіны з сябрамі і сваякамі, матэрыяльныя ўмовы і інш. Каханне нельга раздзяліць на дзве роўныя паловы, і рэцэпт шчаслівага кахання, на жаль, ніхто не можа выдаць. Таму зусім справядліва гучыць перасцярога Галіны Атрошчанкі: *Беражыце каханне, Як святло для душы! Каб дарылі спатканні Вам спакой у цішы. Беражыце каханне Ад нядобых людзей, Каб было расставанне Поўным светлых надзей.*

Кажуць, што паэт у кожным творы разам са сваім лірычным героем пражывае часцінку жыцця. Багаты жыццёвы вопыт Анатоля Вярцінскага дазволіў выказаць парады юным закаханым:

Кахайце, ляціце да сонца ікарамі,
адзін аднаго асыпайце скарбамі.
асыпайце самацветамі –
ласкамі, клятвамі, марамі светлымі!..

Аб сапраўдным каханні нельга гаварыць усяму свету, бо яно выражаецца сэрцам, душою. *«Каханне і веру не трэба Усім выстаўляць напаказ: Душа толькі чуе і неба»,* – перасцерагае Рыгор Барадулін.

Праўда, сёння шматлікія парады і рэкамендацыі па самых розных пытаннях узаемаадносін мужчыны і жанчыны (як знайсці і захаваць каханне? як паводзіць сябе ў адносінах да любімага чалавека і выклікаць добрае ўражанне? як навучыцца стрымліваць пачуцці? як адрозніць сапраўднае каханне ад мімалётнага захаплення? як выбіраць спадарожніцу жыцця? і інш.), ілюстрацыі ўзораў самаадданага кахання ў гісторыі і літаратуры, крылатыя выслоўі і афарызмы пра каханне змешчаны ў рознага кшталту энцыклапедыях і «падручніках кахання» [Гл.: Багдановіч і Багданаў; Душэнка; Лаундэс; Сахарава; Фаліянц]

Спадзяванне на новае нязгаснае пачуццё, радасць ад нястрачанай любові можа перадавацца шматлікімі спалучэннямі назоўнікаў-метафар: *Я спадзяюся на сяўбу, На кожны лісцік новы. На залатую* ***малацьбу*** *Трывожнае* ***любові*** (Я.Янішчыц). *На твары прачытаю засмучэнне, З якога* ***зніч любві*** *ўзгарыць ярчэй* (М.Віняцкі). *Сярпы* ***палосачку*** *не зжалі Маёй* ***пяшчоты і любві*** (В.Гардзей).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Увасабленнем прыгажосці, загадкавай таямніцай заўсёды была для закаханага яго любая дзяўчына. Пісьменнікі, раскрываючы вонкавую прыгажосць каханых, глыбіню цудоўных пачуццяў, ідэалізавалі і абагаўлялі сваю адзіную і непаўторную, называлі яе *абранніцай восокага неба, палётам, шчаслівых мар, глытком вады ў засушную спякоту* (М.Шабовіч), *суладдзем мар* (У.Хадыка), *явай вечных летуценняў* (Я.Сіпакоў), *чыстай веснавою журбой, ціхаю казкай* (Г.Бураўкін), *збавеннем ад нямоты* (Л.Дранько-Майсюк), *спадарожніцай русакосаю* (К.Жук), *незямной неспадзяванкай* (С.Законнікаў). Цэлы ланцужок эпітэў выкарыстаў Паўлюк Прануза для ўсебаковай характарыстыкі сваёй каханай: *Ты – снежная, марозная, ласкавая, сур'ёзная, Гасцінная, прыветная, сардэчная і светлая. Ты – зорная, праменная, каханая, нязменная.*

Погляд на каханую дзяўчыну праз ружовыя акуляры звычайна назіраецца ў пачатку любоўных адносін, якія характарызуюцца асаблівай палкасцю, страснасцю. І гэта зразумела. «Любоў часта асляпляе закаханага », – пісаў Платон. «Калі мы кахаем, то губляем зрок», – пацвярджаў платонаўскую думку іспанскі драматург Лапэ дэ Вега. Закаханы чалавек, асляплёны страсцю, у сваёй каханай не заўважае недахопаў і бачыць станоўчыя якасці там, дзе яны адсутнічаюць. Стэндаль растлумачваў такую ілюзорнасць і двайную оптыку сваёй тэорыяй крышталізацыі: простая ветка, кінутая ў салёную капальню, праз час пакрываецца крышталямі, і ўжо ніхто не пазнае ў такім бліскучым цудзе былога нязграбнага прута; тое ж адбываецца і з каханнем, калі любімага чалавека надзяляюць, як крышталь, тысячамі дасканаласцей [Стэндаль, с. 226-227]. Але так «пабудаваны» чалавек, што не можа не ўзвышаць таго, каго кахае: *Ты – маё неба, высокае, чыстае... Ты – маё сонца, пяшчотнае, шчодрае... Ты – маё мора, бурлівае, ціхае* (З.Прыгодзіч). *Ты са мной, летуценнага шчасця заранка. Я цалую цябе, апякаючы вусны... Ты – каханне маё, ты – любові маёй паланянка. Ты – усмешка маёй неадольнай спакусы* (Л.Пранчак). *Ты – працяг жыцця зямнога, Ты – замова ад пракляцця,.. мая зямная зорка, і шчырасць, і спагада, і песня, і надзея* (Х.Гурыновіч).

У асобных выпадках увага акцэнтуецца на працягласці шляху да кахання і ўпэўненасці ў непазбежнасці жаданай сустрэчы. Дзякуючы выкарыстанню шматлікіх гіпербалаў, паэты ствараюць яркі малюнак «чакання » каханння з крыху антытэзнай і іранічнай канцоўкай: *Сто гадоў ты прагнуў гэтай стрэчы, Сто гадо чакаў ты гэтых воч, Знаючы, што прыйдзе гэты вечар, Верачы, што будзе гэта ноч! Сто гадоў ты смяг без гэтых вуснаў, Сто гадоў чарсцвеў без гэтых рук... Што ж цяпер так горка ты ўсміхнуўся? Уявіў стагоддзе новых мук?* (Н.Гілевіч). *Мільёны дзён мяне кахаў, Мільёны дзён ішоў з нябыту, З'явіўся ўрэшце і сказаў: «Як дзіўна, мною ты забыта»* (Р.Баравікова).

Важнае месца ў дуэце закаханых належыць юнаку, адважнаму рыцару і абаронцу каханай. Каханне акрыляе іх, усяляе смеласць, заклікае да высакародных учынкаў, подзвігаў, гераізму, высокіх здзяйсненняў: *Я ... растаю боязі льдзіны, Садзьму недаверу барханы – Каб толькі пачуць:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*«Адзіны!», Каб толькі адчуць: «Каханы!»* (Р.Барадулін). Дзеля заваёвы сэрца каханай лірычны герой вершаў Генадзя Бураўкіна гатовы *«звярнуць гор хрыбты»* (верш «Зноў пабачыў цябе…»), *«пайсці і зноў перамагчы сто слот і завірух, заблытаць тысячу дарог і выпіць дзесяць рэк, і любай палажыць да ног увесь свой скарб і грэх»* (верш «Такі спрадвечны лёс мужчын»), *прывезці ў падарунак з далёкае дарогі «падкову – месячык двухрогі – і зорку – сінюю слязу* » (верш «Другія»), здзейсніць іншыя подзвігі. Больш прыземлены лірычны герой верша Васіля Зуёнка «Не бяжы, не ўцячэш ад сябе» выяўляе высакароднасць, прыгажосць ва ўчынках і адносінах да каханай, бязмежнай адданасці ёй:

Буду садам тваім па вясне,
Буду ў полі сцяжынкай забытай:
Перапёлка на золку засне —
Прыбягай дажынаць сваё жыта.
Буду раніцай лёгкім дымком
Над страхой тваёй віцца ў просінь,
Буду ціхім дымавіком
Сны жаданыя ў хату прыносіць.

Сапраўднае каханне вернае і верыць. «*Без вернасці – няма і кахання*», – сцвярджае Х.Жычка. Вернасць, адданасць, прызнанне ў бясконцай любові – даволі пашыраны лейтматыў у беларускім паэтычным дыскурсе: *Я твой, я твой вечны садоўнік, І покуль я ёсць – тваіму саду цвісці…(*Э.Зубрыцкі). *Я цябе не аддам нікому, Спадарожніца русакосая. Прыраўную да ветру, да грому, Да травы, калі будзеш босая* (К.Жук). *І ўсе кветкі і травы Пакладу табе моўчкі да ног, Ад нязнанага шчасця, Ад удачы сваёй захмялелы, малады і наіўны І твой раб, І твой Бог* (Г.Бураўкін). *Мне цяжка нават уявіць, Дзе б апынуўся я сягоння, Калі б не здолеў паланіць Цябе і стаць тваім палоннікам* (У.Шпадарук). *За табой, як нітка за іголкай, Я па свеце да канца пайду* (М.Калачынскі).

У чароўным свеце кахання валадарамі з'яўляюцца двое – ён і яна. Яны, як два полюсы магніта, прыцягваюцца адзін да аднаго. Закаханыя сэрцы шукаюць адно ў другім падабенствы, і каханне, на думку многіх, саюз раздзеленых частак першапачаткова адзінай істоты. Міф пра раздзяленне Зеўсам двухполых і двухцелых істот (андрагінаў) на дзве часткі, якія да гэтага часу шукаюць свае «палавінкі », знаходзіць сваё адлюстраванне ў многіх паэтычных радках. Упэўненасць у такой сустрэчы, магчыма, незямной, гучыць ў радках Ніны Мацяш:

Мы стрэнемся, хоць нас ужо не будзе,
Не будзе ні мяне, ані цябе.
Наступнікі, нязнаныя нам людзі,
Аявяць немагчымае цяпер.

Пошукі каханага чалавека – нялёгкая справа. І калі гэта адбываецца, то дзве «палавінкі » становяцца арганічнай цэласнасцю, дзе немагчыма існаванне адзін без аднаго: *З'яднала нас прырода удваіх, Як два крылы – свайго палёту прыклад, Як два вечназялёныя гаі, Як хвалі дзве, што абняліся звыкла* (Я.Сіпакоў). *Ты – гэта я. Я – гэта ты. Выйшлі абое сюды з любаты, З неразгаданай нікім мілаты* (С.Законнікаў). *Мы родныя крывёй і духам, Мы – духу і крыві зліццё.* (У.Някляеў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І зразумелымі кожнаму становяцца ўзвышаныя радкі Адама Русака аб жаданні быць побач з любімым чалавекам усё жыццё:

Толькі з табою мне хочацца быць,
Толькі з табою.
Радасць, і гора, і шчасце дзяліць
Толькі з табаю.

Часам закаханыя асобы супастаўляюцца, і ў антытэзным малюнку ўзвышаецца і абагаўляецца тая адзіная і непаўторная: *Пакуль у сэрцах кроў бруіцца, Ніколі нам не разлучыцца: Ты – **Сонца**, а я – **Месяц** твой!* (Э.Валасевіч). *Будзь мне **княгіняй** да скону. Я – твой **князь!*** (М.Шабовіч). *Стаяла нас двое – я і **царэўна*** (У.Паўлаў). У асобных выпадках супастаўленне ажыццяўляецца па лініі радасць – боль, лес без птушак – рака без вады: *Я не магу, каханая, нічым утаймаваць душэўную палярнасць; ты – **дня** майго засмужанага **радасць**, я – **боль** твае маланкавай **начы*** (М.Федзюковіч). *Твая душа – як **лес** без салаўя. Мая душа – як **рэчышча** сухое (*Х.Гурыновіч).

Паводле сцверджанняў псіхолагаў, пачуцці закаханых неаднолькавыя па сіле выяўлення: у аднаго яны, як на дакладных шалях, ураўнаважаныя, спакойныя, у другога – больш імпульсіўныя, узбуджана-нервовыя. Больш закаханы чалавек, як правіла, становіцца ахвярай кахання, вязнем, рабом, заложнікам сваіх пачуццяў. Вось як пра гэта сцвярджаецца ў паэзіі: *Каханне, ты — прывабная быліна, дзе з двух герояў нехта **вечны раб*** (Р.Баравікова). *Мая любоў!.. Ужо і мне пад трыццаць — Я ж **раб** тваіх **жаданняў** зноў і зноў* (У.Лісіцын). *Ці ж навечна я твой **вязень**? Ці ж мая навечна ты?* (В.Стрыжак). *Ці ж з гэтым, браце, саўладаеш? Ратунку ад яго няма… Як прывід, па зямлі блукаеш, Я – **вязень**, ты – мая **турма*** (Э.Валасевіч). *Я твой **нявольнік**, Твой **прыгонны**, Я вольную ў цябе прашу* (Р.Барадулін).*Не я цяпер рашаю лёс яе [Марысі], — **Заложніцы** святой **любві** свае, Любві, якой не мне даваць парады* (А.Куляшоў).

*«У закаханых – рыцарскае званне!»,–* пісаў Сяргей Панізнік. І таму яны па рыцарскіх законах павінны знаходзіць выйсце з самых складаных жыццёвых сітуацый, з годнасцю несці званне каханага і з такой жа годнасцю пераносіць страту кахання. Удзячнасць за былое каханне, пажаданне новага шчаслівага жыцця і павага да каханага чалавека гучаць у шчымлівых развітальных радках: *Я за цябе памалюся, Каб у далёкай цішы Жыў ты ні ў горы, ні ў скрусе – З ясным святлом на душы* (А.Бадак). *Імя тваё мне не перабаліць. Ніколі. Знаю. Быў і ёсць. Любімы* (Н.Мацяш). *Каханне маё прайшло. Яго ты не зберагла. Як бы там ні было, – Дзякуй, што ты была* (Л.Пранчак). *У жыццёвай імжы я каханне, як ношу, пранясу у душы* (В.Гарановіч).

Тэма кахання – усеабдымная. Каханне ўслаўлялі і ўслаўляюць пісьменнікі ўсіх часоў і народаў. Яно лічыцца галоўным выпрабаваннем жыцця, якое загартоўвае душу чалавека, пазбаўляе яго прагматычнасці і эгаістычнасці, раскрывае вялікія стваральныя сілы. У выражэнні ўсіх нюансаў кахання і яго шырокай спектравай гамы ўдзельнічаюць практычна ўсе моўна-выяўленчыя сродкі, якія надаюць семантыка-стылістычнай аснове

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

твора большую экспрэсію, вобразнасць. Дзякуючы ўмеламу выкарыстанню такіх сродкаў можна больш яскрава ўявіць ўнутраны стан герояў, адчуць і перажыць абуджэнне кахання, таго першага пачуцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ